-- Хварэю я часта. Калі ўсе хваробы пералічыць, то багата набярэцца. Ну ды гасподзь з імі, вы ж не доктар, і я не з гэтым да вас. У кардыялагічным аддзяленні ў нашай бальніцы ёсць загадкавая палата. Так, так, не здзіўляйцеся. Я раней яшчэ заўважыла, гады тры назад, -- «з сэрцам» тады ляжала. Якраз наша палата была насупраць, і калі дзверы адчыняліся, жанчыны стараліся хоць вокам зазірнуць, што ж там. Раскошная, скажу вам, палата -- з халадзільнікам і ложкам на калёсіках. Мужчына тады лячыўся. З транзістарам на прагулку выходзіў. А як яго выпісалі, жанчына з'явілася. Мажная, прыгожая, у спартыўным касцюме. Як ноч-дык дамоў. Мы яшчэ дзяжурнаму ўрачу паскардзіліся: «Ёй, значыць, і дамоў можна?» А той у адказ: «Не ваша справа!» Злосна так. Ну, мы і змоўклі. А самі за жанчынай назіраем. А як жа! Яна ж не такая, як мы ўсе, грэшныя, -- цікава! Бегаць на ноч дамоў ці куды там -- можна, тут яна здаровая, а каб хоць раз у сталоўку схадзіла, не бачылі. У палату ежу заносілі. Прынцэса! Не, каб жа хоць была чалавекам, а то глядзіць на ўсіх звысоку, з пагардай: маўляў, хто вы такія? Не крыўдна, скажыце? Чаму адным -- такія ўмовы, а другім іншыя? Я разумею: трэба і такія палаты для цяжкахворых, якім цішыня неабходна, але не для такіх, хто транзістар слухае. Бальніца ж дзяржаўная, і мы ў дзяржавы на аднолькавых правах. Пазней даведаліся: то -- жонка начальніка. Нават нідзе не працуе. А я зваршчыцай рабіла ледзь не ўсё жыццё, пакуль во здароўе не падарвала. Яшчэ б калі сам начальнік -- можна неяк змірыцца, хоць і яму пablажак не трэба даваць, а то запанее хутка.

Схапіла мяне нядаўна зноў хвароба, і -- верыце? -- мяне паклалі ў тую загадкавую палату. Спярша нават не верыла. Было ад чаго здзівіцца -- спакой, цішыня, ложак мяккі. Тут, думаю, калі паляжыш, то і дваццаці аднаго дня не трэба, як заведзена. Хутка, відаць, папраўлюся. На абед, праўда, сама хадзіла, снеданне ніхто не прыносіў, а каб прыносілі, хлусіць не буду, не пярэчыла б -- чаму б і ні паляжаць, як каралева? Толькі заўважаць пачала я за тым жа сталом, што неахвотна ўступаюць са мной у размову суседкі, насцярожыліся. Чужая я для іх. Што ж, думаю, я нарабіла, навошта згадзілася ў тую палату лажыцца? Сумна ж там, а жанчыны і пагавораць сабе, і пасмяюцца -- смех таксама лечыць. Памылілася, калі думала, што ў гэтым пакоі таямнічы рай. А як жа яны, выбраннікі, лечацца? Ці ім усё роўна -- з людзьмі або без людзей? А можа, каб хоць трошкі, але нечым адрозніваца? Усё, рашаю, хопіць для мяне такога лячэння, буду прасіцца да баб. А тут і выпадак падвярнуўся --абход якраз. Галоўны ўрач адразу ж, як толькі пераступіў парог, пытае ў Дануты -- гэта наш доктар:

-- А гэта жанчына чаму тут?

Данута нават разгубілася, зніякавела, потым ціха кажа:

-- Лечыцца...

А той:

--Прашу неадкладна перавесці ў іншую палату. Тут нельга.

Данута ўздыхнула, кіўнула галавой -- маўляў, зразумела. А мяне злосць узяла. Калі раней хацела сама прасіцца адсюль, то цяпер, думаю, не саступлю -- бачыце, «неадкладна».

Закончылі яны свой абход і пайшлі. Адразу ж каманда: пераходзь, Селязнёва! Думала,што пазмагаюся, але не, хуценька сабрала свае транты і патупала за сястрой: «Паказвайце, куды?» Так добра мне стала... А ўвечары з той палаты выйшла кабета ў халацiку. Бабы перашэптваюцца:

-- Чыя жонка?

-- Не ведаю.

-- Мужык, відаць, у яе начальнік?

-- Хто ведае...

Яны ж, відаць, і пра мяне гэтак гаманілі. Хто я, чыя жонка? А ў мяне мужыка няма: у арміі падарваў здароўе, даўно як памёр. Дарэмна галовы ламалі. Узяла я ўсё ім расказала. Пасмяяліся. Сяргееўна, яна рабіла бухгалтарам, сказала, што такія палаты на кожным паверсе ёсць. Аднаго прараба паўгода з паверха на паверх пераводзілі -- пакуль ён рамонт у бальніцы не зрабіў. Цікава -- ад якой хваробы яго лячылі?

Вось і прыйшла, каб ведалі вы пра палату. У бальніцы казаць баялася: даведаюцца, дык загадчыца аддзялення на абходзе не заўважыць, а то яшчэ не тыя лекі прыпіша. Ці можа такое быць? Не ведаеце? Мяркую, што можа. Бо ў некаторых дактароў хоць і белы халат, але ў плямах. А я прапаную, каб усіх лячылі аднолькава, а ў той палаце паставілі два ложкі, халадзільнік -- на калідор для агульнага карыстання, бо адзнаго мала. Тады хворым будзе лягчэй... Яны ж -- людзі, усё бачаць і чуюць.

Я тут прозвішча сваё назвала. Толькі вы не пішыце яго, а то я часта ў тую бальніцу наведваюся. Вы мяне разумееце?

Васіль Ткачоў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, г. Гомель

Парасятка

Жыве Матруна ў канцы вёскі. Жыве адна. Хатка маленькая, прысадзістая, з замшэлым дахам і гарбатая, як сама гаспадыня. Яе адразу пасля вайны сыны, тады яшчэ хлапчукі, з тонкіх бярвенцаў зрабілі. Плот гнілы, пахілены, вароты раструшчаны. На двары замест дроў — галлё, якое старая нацягала да сябе з лесу.

Сыноў у яе трое. Усе ў горадзе жывуць. Пісьмы не пішуць, Матруну не адведваюць. Раней, калі яна была здаровай, трымала карову, свіней і курэй, прыязджалі да маці, а цяпер — не. Так і жыве адна ўжо сорак гадоў. Пенсія невялічкая, перабіваецца з хлеба на квас.

Матруна апошні год не распускала свае "зайчыкі", збірала іх, каб купіць на кірмашы парася.

Паехала ў мястэчка і, нарэшце, купіла. І нібы адразу паздаравела: пажвавела, не магла ад радасці знайсці сабе месца ні ў хаце, ні на двары.

Прыбегла зірнуць хоць адным вокам на парасятка суседка Прося.

— Прывезла? — яшчэ з варот пацікавілася яна.

— А як жа! Ужо ў хляве чмыша... Такое маленькае, пацешнае! Ну, як малое дзіця. І рахманенькае!

Матруна ўсміхнулася. На маршчыністым сухенькім твары заблішчэлі блакітныя вочкі. І нават яе падраная курткачка, якая засталася ад малодшага сына, нібы зрабілася навейшай.

— А паглядзець можна? — шэптам, нібы баялася патрывожыць жывую істоту, спытала яна. — Не бойся, не сурочу.

— А я і не баюся. Ведаю, што ў цябе вочы добрыя, — таксама ціха азвалася Матруна.

І яны крадком, на дыбачках, каб не напалохаць парася, пайшлі да хляўчука, адчынілі варотцы.

Маленькі ружовы вепручок, нібы дзіця, якое толькі што адарвалі ад матчыных грудзей, стаяў на беленькіх капытках і, убачыўшы ў варотцах святло, радасна піскнуў. Ён паспрабаваў было ступіць насустрач Матруні і Просі, але заблытаўся ў саломе і паваліўся набок.

— Які прыгажунчык! — не магла надзівіцца Прося на парася. —Чысценькі, дагледжаны і гладзенькі. Ну, як лялька! І як ты такога выбрала на кірмашы?

— Доўга там тупала, але выбрала, — пахвалілася старая. —Бачу дзед сядзіць у капелюшы... А каля яго ног ляжыць і варушыцца нібы жывы мех. "Мо парасятак прадаеце?" — пытаюся. "Усе ўжо прадаў, — адказвае. — Толькі адно засталося". І разгарнуў мяшок. Зірнула я на парасятка, пацанавалася —дорага просіць. Дай, думаю, яшчэ па кірмашы паблытаюся, можа танейшага парсючка надыбаю. І, верыш, толькі ступіла крок ад таго дзеда — парсючок як завішчыць, хоць вушы затыкай. Гэта ён так плакаў, мяне да сябе клікаў... Спынілася, яшчэ раз на свінчо паглядзела: і ножкі роўныя, і вушкі тырчком стаяць, і галоўнае — хвосцік кручочкам. Ну, думаю, гэта мой. І не цанавалася ўжо з дзедам. Купіла...

— Пашанцавала табе, Моця. Добранькае купіла парася, —пахваліла суседку Прося. — А есці просіць?

— Яшчэ як! Верашчыць з раніцы. Я яго пойлам цёпленькім мучным адпойваю з соскі. — Яна выняла з кішэні і паказала суседцы бутэльку. — Вось гэтым.

Нагнулася і тыцнула соску ў лычык парасяці. Яно прагна схапілася за соску, пачало яе са смакам смактаць, павільваць ад асалоды хвосцікам — вужачкай.

— Год буду яго карміць і даглядаць, каб вялікі і гладкі вырас парсюк. Каб багата сала і мяса на ім нарасло. А потым напішу сынам: прыязджайце калоць. Ці прыедуць? Як ты думаеш?


— О-го! — выгукнула Прося. — На крыллях прыляцяць! І ўсё мяса і сала ў сумкі ўтопчуць. Тады толькі застануцца вушкі ды ножкі. І хвосцік у прыдатак...

— Ну і няхай. Няхай бяруць тое мяса і сала... А я зноў парасятка куплю і буду гадаваць, каб зноў сыноў на сала прыманіць. Бачыць каля сябе іх вельмі ж хочацца...

Мікола Капыловіч

ПОГЛЯД

Не павінен быць жабраком



Дрэнна чалавеку, калі ён адзін... Фота Я. Пясецкага

Некалькі гадоў таму мне давялося сутыкнуцца з лёсам Аркадзя Іванавіча Мільто — інваліда-бомжа і распавесці пра яго на старонках "Нашай долі". Пасля выхаду матэрыялу доўгі час яшчэ бачыла я жабрака на прыступках станцыі метро "Плошча Якуба Коласа": як заўсёды, збіраў людскія падаўкі ў сваю скамечаную шапку, чамусьці ўпарта не жадаючы прымаць грамадскай міласці ў выглядзе Дома састарэлых. Потым раптоўна некуды знік і таксама нечакана з'явіўся, растлумачыўшы, што больш не спакусіцца "вольным" заробкам каля маскоўскіх знакамітых месцаў: гады не тыя, каб вытрымаць канкурэнцыю і падаткі розных "дахаў" і "нішаў" (гэта — своеасаблівыя "надбудовы" над жабракамі, ятачнікамі, дробнымі вулічнымі гандлярамі і г. д.).

Памятаю, што пасля той размовы я жартоўна зрабіла выснову, што не толькі "дым Айчыны нам салодкі і прыемны", але і свой айчынны, мінскі, рэкецір больш прывабны за маскоўскага. Але праз пару тыдняў Аркадзь Іванавіч знік з сумнавядомых прыступкаў, і больш я яго ўжо ніколі не бачыла. Быццам бы спусціўся чалавек у падзямельны свет метрапалітэна і застаўся там назаўсёды. Праз знаёмых старога я нейкі час імкнулася навесці даведкі, але — марная праца. Ніхто нічога не ведаў, да таго ж, праўду кажучы, і не жадаў ведаць. Для сябе ў гэтай гісторыі я паставіла кропку. Не ведаю, што здарылася з грамадзянінам Мільто — самае дрэннае ці не вельмі, але ў мяне чамусьці з'явілася ўпэўненасць, што менавіта так яны і знікаюць — адразу і назаўсёды — гэтыя людзі на мыліцах, з шапкай у працягнутай руцэ, якія збіраюць дробныя грошы ўвесь дзень, больш марачы пра шклянку віна ці гарэлкі, чым пра абед у гарадской сталоўцы, куды яго, бруднага і няголенага, не хочуць пускаць, бо "чыстая" публіка ставіцца больш чым адмоўна да падобных кліентаў.

Тое, што здарылася з нашым грамадствам, нейкі заўзяты хімік ці фізік назваў эксперыментам. І ўспомніўшы ўсім вядомую фразу ўсім вядомага дзеяча, дадаў: у асобна ўзятай прабірцы. Хацелася б верыць, што час працяглага, не без ліхасці пастаўленага сацыяльнага эксперымента падыходзіць да канца. (Ці, можа, толькі сканчваецца яго чарговы этап?). Бурлівыя працэсы апошніх гадоў далі хоць і сумніўныя, але ж вынікі. Рэакцыя паміж старой сістэмай і нейкімі кроплямі яшчэ не вызначанай будучыняй адбылася. Раствор пачынае адстойвацца. Ужо відаць, што ўсплывае наверх. Добра прагледжваецца асноўны слой грамадства — празрысты, як дзіцячая сляза, бо не мае ні наяўнасці ў кішэнях, ні рахункаў у швейцарскіх банках. Ціха варыцца ў сваім сочыве чамусьці прыціхшы шэры наш люмпен. Урэшце, нешта выпала ўжо і ў асадак.

На жаль, мы амаль не здзіўляемся, калі бачым на вуліцах, у падземных пераходах ці на той жа Камароўцы "гэтых агідных" жабракоў і бомжаў. У іх — сваё жыццё, у нас — сваё. Але ўявіце сабе на хвілінку, што аднойчы вы губляеце ўсё: кватэру, прапіску, рэшткі здароўя і сям'ю. Вы — стары, хворы, у вас малая пенсія і ў вас няма нікога з блізкіх. Адрынуўшы тую адзіную жыццёвую кампенсацыю, якую ненастойліва прапанавала вам дзяржава — Дом састарэлых, вы на старасці год пачалі весці жыццё бадзяжкі і папрашайкі. Вы бомж, як гаворыцца, выпалі ў асадак, цяпер у вас свае рахункі з жыццём і грамадствам. Як у майго старога знаёмага Мільто, які знянацку знік, але растыражаваны тыпаж якога можна бачыць шмат дзе і ў сталіцы, і ў іншых гарадах.

Увогуле кажучы,трэба было б адзначыць, што бомжаства і жабрацтва як грамадскія з'явы, мабыць, ніколі не знікнуць на свеце. Сітуацыя значна пагаршаецца, калі жыццё ўсяго грамадства і кожнага асобнага чалавека з нейкага моманту страчвае ўстойлівыя формы і строга акрэсленыя контуры, якія робяць любы лад жыцця, нават жабрацтва, у нечым прывабным. Які-небудзь англійскі папрашайка, які праводзіць ноч на лаўцы, прыкрыўшыся стосам пажаўцелых "Таймс", — гэта ж бальзам на сэрца любога добраўладкаванага англічаніна, які, ідучы раніцай на працу, з задавальненнем мацае поглядам такое кантраснае пацверджанне свайго ўласнага дабрабыту і спакою.

Наш бомж — з'ява агідная і нічога рамантычнага і маляўнічага ў ёй няма. Бывае, што міжволі каго-небудзь пачынае тачыць падазрэнне: а ці не жыве гэты "жабрак" лепш, чым я? Ці не завёў ён за тыя грошы сабе "Мэрсэдэс" і кожны дзень, адмыслова апрануўшы "робу", ці ні ездзіць да нас за нашы ж грошы, як на працу? Глупства!

Я спадзяюся, што прыйдуць лепшыя часы, з'явіцца і не будзе саромецца сваіх прыбыткаў верхні сацыяльны слой — каста людзей з кейсамі, якія будуць так будаваць эканоміку, каб была выгаднай не спекуляцыйная дзейнасць, а вытворчасць. Перабродзіць і зойме ўстойлівае становішча сярэдні клас, які з'яўляецца фундаментам і гарантам любой нацыі. Разам з тым, напэўна, застануцца і тыя людзі, якія замест дабрабыту аддадуць перавагу жабрацтву і бомжаству. Якім будзе гэты будучы жабрак? Можа, стылізаваны лахматы хлопец з гітарою, кінуўшы на якога позірк, абывацель узгадае, што ёсць і іншае жыццё. Яно, канечне, не вабіць, яно не для большасці, але важна ведаць, што іншы раз яго выбіраюць не з прычыны малой пенсіі па інваліднасці ці нечага падобнага да таго.

Л. Суднік

Белые пятна истории

Обреченные на смерть

Октябрьские бури 1917 года основательно искорежили судьбы офицеров царской армии. В годы интервенции и гражданской войны они добровольно перешли на сторону Советской власти и отважно сражались в рядах Красной Армии на разных фронтах. Гонения начались в основном в 30-х годах. Их, выходцев из дворянского сословия, начали заменять командирами из рабочих и крестьян.

Под жернова жестоких репрессий попали и командиры 11-го корпусного артполка. По сфабрикованным делам их обвинили в причастности к монархизму, оккультному обществу "Орден св. Грааля", подрыве боевой готовности полка и осудили как социально чуждых элементов.

О расправе над "бывшими" и рассказывается в этом очерке, написанном на основе архивных документов органов ОГПУ-КГБ, которые долгие годы хранились под грифом "Совершенно секретно".

* * *

В осенние дни начальник артиллерии 11-го корпуса Николай Гусаков неизменно приезжал из Смоленска на полигон у Дретуни, где гремели, сотрясая землю и воздух, артиллерийские залпы. В такое время года там, завершая лагерный сбор, состязались обычно свыше 70 батарей из всего Белорусского военного округа.

В царской армии Николай Павлович служил в чине прапорщика. Теперь ему было за тридцать. Ладно скроен, безупречная выправка, умное лицо. На груди -- орден Красного Знамени, награда за храбрость в боях. Ему завидовали, им восхищались: какая карьера, какой военный талант!

Корпусной артполк нередко одерживал победы на учениях. Так было и в 1928 году. И хлебосольный, уже в летах, командир полка Александр Калинин, в прошлом поручик из Гродно, радуясь достижениям своих батарейцев, пригласил начальника артиллерии, а также начальника штаба полка Евгения Клейтмана и его заместителя, бывшего штабс-капитана Анатолия Смирнова, человека элегантного, с аристократическими манерами, отужинать в домашней обстановке. Сам Калинин не пил, но гостей потчевал со всей щедростью.

Поддерживая общий разговор, Гусаков читал стихи Сергея Есенина. Поэт, правда, был не в чести у власть имущих, но слишком уж будоражила души его поэзия. Николай Павлович прочитал рукописные строки поэта, в которых тот высмеивал Демьяна Бедного, поселившегося в Кремле, чтобы быть поближе к Сталину. Были в этих стихах и такие строки: "Мужик потянется к Христу, а коммунизму мат пошлет при этом" -- слишком уж смелые для того времени.

Теплые встречи и беседы сближали командиров, избавляли их от гарнизонной скуки. На вечерах они открыто обсуждали политику партии, говорили о слабом техническом вооружении армии, отставании ее от армий зарубежных держав. Говорили и о своей службе. Над ними, "бывшими", сгущались тучи, на них, беспартийных, смотрели с недоверием, и члены ВКП(б) часто ставили их приказы под сомнение. Было ясно, что в армии они нужны лишь до той поры, когда наберутся опыта управления войсками командиры рабоче-крестьянского происхождения.

* * *

Первым на крючке у следователя особого отдела корпуса Василия Хитрова оказался помощник начальника штаба полка Анатолий Смирнов из-за пустякового анонимного письма, которое написал юный шалопай, чтобы немного насолить человеку.

Для озадаченного следователя, получившего инструкции свыше, было достаточно и этой зацепки. Был бы человек, а статья для него найдется. Уж кто-кто, а Хитров наловчился раскручивать дела против "контры". Подбодрил и начальник особого отдела:

-- Церемониться с "бывшими" не станем!

Анатолия Смирнова арестовали сразу же после возвращения из отпуска. На квартире произвели обыск -- изъяли литературу, 52 патрона к револьверу системы "Наган", шашку.

На следующий день его ввели в кабинет следователя.

-- Не волнуйтесь, -- успокоил Хитров. -- Кое-что выясним, и вы сразу вернетесь в полк.

Поначалу Анатолий Михайлович заполнил предлинную анкету, затем особист задавал ему несущественные, на первый взгляд, вопросы о дореволюционной жизни, а потом предложил Смирнову написать, ничего не утаивая, биографию. К исходу дня тот настрочил целых 30 страниц. И ничего подозрительного в той биографии не было: родился Смирнов в Костромской губернии, в семье дворянина. Во время мировой войны сражался в Румынии вместе со своим комбатом штабс-капитаном Николаем Чамарой. В конце 1918 года добровольно вступил в Красную Армию.

Но Хитрова привлекли такие строки:

"В 1919 году, во время наступления войск Юденича, находясь в казармах, мы готовились к боям. Вещевым имуществом у нас на батарее заведовал тогда Гошерон де Лафосс, француз, по-моему, из рода маркизов. Вечерами мы вели беседы на религиозные темы. Шел разговор и об оккультных науках. Разгорались дискуссии между верующими и неверующими. У нас создалось даже чисто образовательное общество под названием "Орден св. Грааля". Руководил им Гошерон. Вскоре я порвал с этим обществом, с чуждой нашему духу религиозной мистикой".

Особист задумался. Коль скоро, по его мнению, на сходках "Ордена" собирались разные по своим убеждениям люди, значит, речь там шла не только о загробной жизни. Не исключено, что это была тайная организация, и бывшие офицеры исподволь вели в полку вредительскую работу. Если вооружиться фактами, со всеми "бывшими" можно разделаться одним махом.

Утром 30 сентября 1930 года Смирнов поставил вопрос ребром:

-- За что арестовали меня? Если я в чем-то виноват, так и скажите. Готов склонить голову перед пролетарским правосудием.

В ответ особист перевел разговор в область оккультных наук деятельности общества "Орден св. Грааля". Договорились, что Смирнов напишет подробно и об этом. И действительно, на четвертый день он передал особисту рукопись объемом в 50 убористо написанных страниц.

"В начале 1918 года, -- писал Смирнов, -- я купил серию романов Крыжановской "Маги", "Гнев божий", "Смерть планеты". В них раскрывалась суть оккультных наук. Будучи склонным к мистицизму, я заинтересовался этим учением. В романах же многое оставалось непонятным, и Гошерон давал мне разъяснения.

В конце 1919 года я был посвящен в общество "Ордена" с центром в Швейцарии и филиалом в России, дав клятву никому не открывать его тайну.

Из глубины веков до нас дошло такое поверье. Когда Иосиф Аримафейский хоронил Христа, ему удалось собрать его кровь в хрустальную чашу и запрятать ее в скале. Во времена крестовых походов рыцарь Грааль нашел эту чашу, доставил в Европу и укрыл в горах. Для охраны ее он и основал братство, или "Орден св. Грааля".

Я ухватился за оккультное учение, как за якорь спасения, но вскоре понял всю химерность этой науки. Тайные планы руководства "Ордена св. Грааля" мне неизвестны..."

Когда изнуренного Смирнова привели на очередной допрос, особист, хитровато улыбаясь, сказал:

-- Вашу рукопись прочитал с большим интересом. Никогда ничего подобного, признаться, не читал.

-- Вот видите, какие это науки!

-- Ну, а кто еще в полку интересовался оккультизмом? Говорите смело. Это не для протокола.

И добродушно настроенный Анатолий Михайлович назвал имена командира полка Александра Калинина, начальника химслужбы Николая Чамары, штабных командиров Александра Андреева и Николая Овчинникова, а также Александра Чернавина, Станислава Цейсана и Александра Соколова. Поколебавшись, добавил фамилию начальника штаба Евгения Клейтмана. Все они в какой-то мере были его единомышленниками, все -- "бывшие".

Этот допрос дал следователю В. Хитрову пищу для новых размышлений. Коль скоро офицеры, некогда служившие царю, собирались вместе и говорили об "Ордене св. Грааля", их следовало бы объединить в одну тайную вредительскую группировку. Эти "бывшие" наверняка говорили о восстановлении в России монархии. Нет при Советской власти им доверия!

День за днем Хитров раскручивал дело о "контрреволюционной" группировке в полку. Ловко запутывая людей, он искажал и подтасовывал факты, делал несусветные выводы. А те характеристики, которые арестованные Анатолий Смирнов и его однополчане давали друг на друга, оказались для особиста сущим кладом.

Анатолий Михайлович, доведенный изнурительными допросами до отчаяния, в один из дней вернулся в камеру и, потеряв сознание, рухнул на цементный пол.

Следователь дал ему передышку, а сам в это время слал нужные ему запросы. Из города на Неве поступила копия заключения по делу Гошерона де Лафосса и возглавляемого им филиала "Ордена св. Грааля". Выяснилось, что в сети этого оккультного "Ордена" были втянуты сотни мистически настроенных людей. Вся верхушка этой организации была арестована и сослана на Соловецкие острова.

* * *

Узнав об арестах своих однополчан, Анатолий Смирнов резко изменил свои показания, доказывая особисту их невиновность. Но Хитров со свойственными ему инквизиторскими замашками по-прежнему доводил бывшего штабс-капитана до исступления, говоря:

-- Это вы завербовали людей в свою группу, а теперь пытаетесь выгородить их. Не выйдет! Не советую брать на себя чужую вину. Это вам дорого обойдется! Лучше расскажите, как вы затягивали в свою группировку командира полка, начальника штаба и остальных.

Истощенный морально и физически, Смирнов готов был подписать любой поклеп на себя, лишь бы поскорее избавиться от этих допросов. И когда Хитров задал вопрос о планах подрывной деятельности тайной организации, арестованный ему в угоду выдал то, чего ему особенно недоставало в разбухшем до пяти томов деле:

-- В мирное время срывать планы боевой подготовки артиллеристов, бороться за оттяжку распоряжений сверху. В военное время препятствовать пополнению полка. Вести агитацию против Советской власти. Осуществлять шпионаж в пользу противника.

-- А вы морочили мне голову! Все? -- с затаенной радостью спросил Хитров.

-- Больше говорить не буду!

Ехидная усмешка вспыхнула в глазах следователя. Не буду... В особом отделе корпуса имеются средства, чтобы развязать язык любому упрямцу из врагов народа. Вообще-то сам Хитров не верил в искренность показаний арестованного, однако не провалить же так удачно закрученное дело! Такое с ним не случалось.

Конвоир препроводил Смирнова в камеру. Предельно измученный, Анатолий Михайлович впал в состояние депрессии. Отрешенно смотрел он на окошко, сквозь решетку которого сочился свет угасавшего дня, чувствуя себя подавленным и разбитым. Жизнь потеряла для него всякий смысл...

Одним из последних был арестован начальник артиллерии корпуса Н. П. Гусаков. Будучи человеком дальновидным, Николай Павлович как-то сказал в кругу единомышленников: "Пока военные спецы из "бывших" нужны Красной Армии, из них будут выжимать все соки. Советская власть никогда не переделает их психологию. Выходцы из дворян -- класс обреченных".

Кое-что из того, о чем Гусаков говорил в "семейном" кругу, стало известно в особом отделе, и его высказывания были квалифицированы однозначно -- антисоветская агитация. Николая Павловича лишили всех заслуг, в том числе и ордена Красного Знамени...

Бывшие царские офицеры... Свои у них были достоинства, свои заблуждения и человеческие слабости. Однако ни сочувствия, ни прощения им не было. Подобное недовольство тогда Советской властью высказывали и "настоящие" командиры из рабочих и крестьян, партийцы. Но их не трогали, пока не трогали... Нещадные репрессии лишь начинались. Немного позднее они оборвут тысячи жизней тех, на кого навешивался страшный ярлык "враг народа".

* * *

Веял теплыми ветрами май 1931 года. Большое следственное дело было завершено в основном усилиями В. Хитрова и одобрено начальником ОГПУ по Западной области.

А в мрачных камерах изолятора ждали своей участи "бывшие". Судьба этих "государственных преступников" была предрешена. Дело по обвинению "социально чуждых и опасных элементов" было направлено в Коллегию ОГПУ для внесудебного рассмотрения. Вскоре Особое совещание постановило приговорить арестованных к разным срокам лишения свободы, к ссылке в лагеря ГУЛАГа.

* * *

С той поры отшумели десятилетия. В бывшем Советском государстве, как и в новых, ныне суверенных республиках, произошло немало разных событий исторической важности. Люди получили право свободно высказывать свои мысли и взгляды.

С одобрением встретили они и указы о реабилитации жертв репрессий, которые вернули доброе имя тысячам без вины пострадавших. В их числе оказались и командиры 11-го корпусного артполка.

Борис Наливайко,
подполковник в отставке

Старты мужества

Предместье Минска, где часто проводятся шоссейные автомобильные, мото- и велогонки, известно рекордами скоростей. Но наверное многие будут удивлены, если узнают, что в тот день в Боровом установлены новые достижения, что здесь стартовало мужество.

-- Никогда не участвовал в соревнованиях, но сегодняшний полумарафон привлек меня возможностью проверить самого себя: не потерял ли я, став инвалидом, свойственное человеку стремление соперничать и побеждать.

Эти слова инвалида из города Лиды Виктора Ивулина я сделал бы девизом всех стартов, проходивших под эгидой второго минского международного полумарафона "Боровая-94". Из многих городов СНГ и Балтии съехались сюда инвалиды, прикованные к колясками, потерявшие зрение, имеющие тяжелые нарушения опорно-двигательного аппарата. Оргкомитет обеспечил приехавших бесплатным проживанием в гостинице, питанием. Свое участие в расходах приняли фирмы-спонсоры "Белриас", "Соинво", кооператив пенсионеров "Белвет", Минский горисполком, Белорусское общество инвалидов и многие другие.

Соревновались бегуны на разных дистанциях, инвалиды в комнатных и спортивных колясках. Не первый раз приехал на традиционный минский полумарафон старейший спортсмен из Киева, бывший автогонщик Игорь Григорьев. Не впервые выставила и свою молодую команду специальная школа-интернат из Ратомки. Спортсмены всех возрастных групп сошлись на стартах.

Когда закончились состязания, стало известно, что следующие старты спортсменов-инвалидов намерены приурочить к дням празднования в Минске 50-летия Победы над фашистской Германией. Трассы будущего полумарафона планируется проложить по самым многолюдным кварталам белорусской столицы.


Ну что же, пожелаем успехов и организаторам следующих состязаний, и их участникам.

Текст и фото Евгения Песецкого

На снимках:


- *хорошо выступил в гонках на инвалидных колясках житель города Лиды Виктор Ивулин*
- *судья полумарафона — ветеран белорусского спорта заслуженный тренер СССР Александр Агрызкин*
- *на трассе полумарафона*
- *бегуны на дистанции*
- *спортсмены из Москвы приехали на автобусе отечественного производства, оборудованном специальным лифтом для инвалидных колясок.*











ПРОСТИ, ГОСПОДИ!

Инвалиды делят сферы влияния на здоровых

Российский фонд инвалидов войны в Афганистане образован в 1991 году. Его председателем был избран полковник Валерий Радчиков, лишившийся обеих ног в войне. Сейчас его позиции резко пошатнулись...

Что же произошло? За короткое время фонду удалось создать собственную экономическую базу, с помощью которой инвалидам и семьям погибших оказывалась медико-психологическая помощь. Со счетов фонда, его региональных организаций и филиалов на социальную поддержку инвалидов только за последние годы было перечислено более миллиарда рублей, и, по мнению самих инвалидов, в условиях, когда государство отвернулось от них, помощь фонда была единственным источником для их существования. Однако сегодня, похоже, они лишены будут и этой помощи: фонд захлестнули внутренние распри. Борьба идет уже с выстрелами из пистолетов и ракетниц, взрываются гранаты. Есть убитые и раненые. Разборки привели к тому, что теперь у фонда два председателя.

По мнению заместителя председателя Союза юристов Москвы Сергея Юрьева, попытка сместить Валерия Радчикова была предпринята для того, чтобы завладеть материальными средствами фонда. В ход пошли все средства, начиная от клеветы и кончая физическим устранением неугодных людей...

Казалось бы, в сложившейся ситуации самое разумное -- цивилизованно разделиться и создать две общественные организации. Но инвалиды по этому пути, как показывает жизнь, идти не собираются. Вся штука в том, что указ президента о льготах распространяется только на Российский фонд инвалидов войны в Афганистане. А это — миллиарды рублей, миллионы долларов. Ставки слишком высоки, чтобы инвалиды и те, кто за ними стоят, легко уступили.

Газета "Известия"

СЕ ЛЯ ВИ

Мікола Вяршынін

Як лячыцца я хадзіў

(фельетон)

Прыхварэў я, як на гора,
Хоць у цёплым і хадзіў,
Забалела нешта горла --
Пэўна, недзе застудзіў.

Вось я ў клініку пакрочыў —
Не працуе наш урач,
А другі прымаць не хоча:
— Пацыентаў столькі, бач!

Толькі ўсё ж я не скарыўся:
— Падлячыце горла мне!
Ды між тым прагаварыўся,
Што страляе і ў спіне.

Той падскочыў аж пад неба:
-- Я-то вам дзеля чаго?
Тут неўрапатолаг трэба,
Дык ідзіце да яго.

Што ж, далей накіраваўся:
Трэба верыць урачам.
Ды што страўнік сапсаваўся,
Неяк вырвалася там.

І другі мне доктар кажа:
-- Многа кепскіх тут прыкмет.
Вам зайсці найболей важна
У інфекцыйны кабінет.

Я пайшоў -- і зноў па кругу
Пасылалі ўсе мяне.
А самому вельмі туга:
Будзе толк які ці не?

Быў я нават у адчаі
Ад такіх нядобрых спраў.
Да галоўнага ўрача я --
Не сцярпеў -- пашыбаваў.

Разабраўся той на месцы,
Спачувае: надта ўліп,
І дыягназ даў на месцы:
Тры мае хваробы -- грып.

Змарнаваўся я надзіва
І зрабіўся сам, як цень:
Тры дні ў клініку хадзіў я,
І на два дні -- бюлетэнь.

Накупляў таблетак многа,
Піць іх нельга без нуды.
Лепш узяў бы я такога,
Чым лячыліся дзяды!

Пахадзіў — змог павучыцца,
Давялося зразумець:
Часам, каб ісці лячыцца,
Нам здароўе трэба мець.

Программа телевидения

Понедельник, 17 октября

Белорусское телевидение

16.55 Внеклассное чтение. Анатолий Клышко «Франциск Скорина». 17.15 «Бимбат». Веселый понедельник. 17.30 Новости (с сурдопереводом). 17.40 Новая «Крыница». К выпуску первого номера журнала. 17.50 Белорусский тур. Путешествия, встречи, отдых. 18.10 Областные новости (Брест). 18.25 Новости Би-би-си. 19.00 Аэробика. Уроки Н.Новожиловой. 19.30 Проспект. Информационно-аналитическая программа. 20.00 Пять минут на шутки. 20.10 Спортивный телекурьер. 20.30 Контакт: адреса, предложения, информация. 20.35 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.35 Вертикаль. Почта Президента - размышления о наболевшем. 22.15 На сессии Верховного Совета Республики Беларусь. По окончании - Студия «Телесябрына». Под куполом Вселенной. Погода. «Полоса Симорона». Худ.фильм.

Канал «Останкино»

17.00 Восток-Запад. Золотой и торговый путь России. 17.30 Загадка СБ. 17.40, 20.30 Погода. 17.45 « Кто есть кто. XX век». И.Сытин. 17.50, 20.00, 22.50 Новости. 18.00 Час пик. 18.25 «Дикая Роза». Телесериал. 18.55 «Если...» Авторская программа В.Познера. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.40 Гол. 21.10 Встреча для вас. О.Меньшиков. 21.55 Кабаре «Все Звезды». 22.35 Программа «У». 23.00 Шесть вечеров с Ю.Никулиным. Вечер 3-й. 23.35 Автошоу. 23.50 Пресс-экспресс.

Канал «Россия»

17.25 Спасение 911. 18.20 Устами младенца. 18.50 «Никто не забыт». 19.00, 22.00 Вести. 19.25 Подробности. 19.35 «Спрут-6». Худ. фильм 2-я серия. Часть 1-я. 20.40 Репортер. 21.00 Момент истины. На вопросы А. Караулова отвечает депутат Государственной Думы Л. Некрасов. 22.20 Автомиг. 22.25 Спортивная карусель. 22.30 «Королева Елизавета». Программа Би-би-си. 23.30 Звезды говорят.

Санкт-Петербург

16.55 Будни. 17.10 Выборы-94. 17.55 Храм. 18.30, 21.30 Информ-ТВ. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Большой фестиваль. 19.25 Музыкальный момент. 19.30 «Камилла, или Нераскрытые тайны». Телесериал. 20.15 «Звезды» итальянской эстрады. 20.35 «Когда уходят снега». Короткометражный фильм. 21.10 Телемагазин. 21.15 Телеслужба безопасности. 21.45 Спортивные новости. 22.00 Ваш стиль. 22.05 «Шаги императора». Худ.фильм. 23.20 Футбол. Чемпионат России. «Зенит» - «Ростсельмаш». 2-й тайм.

8 канал

18.00 Мультсериал «Роботехи». 18.30 Музыкальный фильм. 19.30 Мультфильм США. 20.00 Агентство «Пармикс»: «Городские часы», «Новости». 20.25 Восьмой для вас. 20.40 Телесериал «Шансы», 6-я серия. 21.30 Студия «БМ» выбирает... 21.50 Foxy musik. (повтор). 22.50 Натали.

Вторник, 18 октября

Белорусское телевидение

8.00 Утро республики. 8.10 Деловой вестник. 8.25 Под куполом Вселенной. 8.35 Погода. 8.45 Пять минут на шутки. 8.50 «Птичья осень». Киноочерк. 9.00 Внеклассное чтение. Анатолий Клышко «Франциск Скорина». 9.20 «Черепашки ниндзя». Мультсериал для детей и взрослых. 9.45 «Полоса Симорона». Худ.фильм. 11.00 АВС-клуб. Английский язык учим сами. 11.15 Портрет на фоне времени. АО «КИМ» г.Витебск. 11.45 «Искренне Ваш...» Худ.фильм. 13.10 «Песни Розенбаума». Фильм-концерт. 15.10 «Как рождается музыка?» Хормейстр Галина Титова. 15.45 «Нов и К»-топ-10. 16.45 Белорусская литература. Ян Борщевский «Шляхтич Завальня». 17.15 «Бимбат». Сначала было слово... 17.30 Новости (с сурдопереводом). 17.40 Золотая инициатива. Предложения бизнесменов по добыче золота. 18.10 Областные новости (Витебск). 18.25 Новости Би-би-си. 19.00 Экономикст. 19.10 Экономическая волна. Накануне зимы. Прямая линия. 19.55 Калейдоскоп выставок. 20.10 Мультфильм для взрослых. 20.20 Пять минут на шутки. 20.30 Контакт: адреса, предложения, информация. 20.35 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.35 Под куполом Вселенной. 21.45 Погода. 21.55 На сессии Верховного Совета Республики Беларусь. По окончании - «Лада ОМС» представляет:»Моя любовь, моя печаль».Телесериал. «Столица».Тележурнал.

Канал «Останкино»

5.30 Утро. 6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Новости. 7.00 Продолжение программы «Утро». 8.00 «Война гоботов». Мультсериал. 8.25 «Дикая Роза». Телесериал. 9.25 О.Респиги. «Птицы». Сюита для оркестра. 14.00 «Горячев и другие». Телесериал. 15.00 Веселые нотки. 15.30 Между нами, девочками. 16.00 Джем. 16.20 «Элен и ребята». Молодежный сериал. 16.50 Мир сегодня. 17.00 Веди. 17.30 Человек и закон. 17.40, 20.30 Погода. 17.45 «Кто есть кто. XX век». К.Орф. 18.00 Час пик. 18.25 «Дикая Роза». Телесериал. 18.55 Тема. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.40 Из первых рук. 20.50 К 50-летию Победы. «Жажда». Худ.фильм. 22.25 Новые обыватели. 23.05 «Между двух озер и выше облаков». О народных талантах г.Интерлакен (Швейцария). 23.50 Пресс-экспресс.

Канал «Россия»

6.30 Формула-730. 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.20 Требуются... требуются... 7.30 Время деловых людей. 8.00 Всемирные новости Эй-би-си. 8.25 Торговый дом. 8.40 Момент истины. 9.35 Волшебный сундучок. 9.50 Королевская миля. 10.35 Телегазета. 10.40 Крестьянский вопрос. 15.20 «Пиратский остров». Худ. фильм (Австралия). 2-я серия. 15.45 Там-там новости. 16.00 Праздник каждый день. 16.10 Новая линия. 16.50 Не быть динозавром. 17.05 Голоса. 17.35 Повестка дня. 18.00 L-клуб. 18.50 «Никто не забыт». 19.25 Подробности. 19.35 Джаз-клуб. «Веселые ребята из Англии». 20.10 Футбол. Кубок УЕФА. «Динамо» (Москва) -- «Реал» (Мадрид). 22.20 Автомиг. 22.25 Спортивная карусель. 22.30 Экран криминальных сообщений. 22.40 Футбол. Кубок УЕФА. «Нант» (Франция) -- «Текстильщик» (Камышин). В перерыве -- Звезды говорят.

Санкт-Петербург

6.30 Телеканал «Доброе утро». 12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Информ ТВ. 12.10 Волшебная линия. 12.25 «Немецкая волна». 12.55, 13.30, 16.40, 19.25 Музыкальный момент. 13.00 Скорая помощь. 13.35 «Камилла, или Нераскрытые тайны». Телесериал. 14.45 «Дом кино» представляет первые фильмы Никиты Михалкова и Сергея Соловьева. 15.50 «А когда встретишь тигра». Телефильм. 16.10 Музыка детям. 16.20 «Три колеса, фолиант и ...» 16.45 Наш сосед -- Финляндия. 17.10 Выборы-94. 17.55 Открываю для себя Россию. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Большой фестиваль. 19.30 «Камилла, или Нераскрытые тайны». Телесериал. 20.20 По всей России. 20.40 Mip искусства. 21.10 Телемагазин. 21.15 Телеслужба безопасности. 21.45 Спортивные новости. 22.00 Ваш стиль. 22.05 «Мой прапрадед Пушкин». Премьера «Лентелефильма».

8 канал

18.00 Мультсериал «Роботехи». 18.30 Студия «Интекс»: «Новости». 18.45 Музыкальная программа. 19.10 При свечах. 19.20 Мультфильм США. 19.50 БАНТ: «Репортаж». 19.55 ММ-4: «Немецкая волна». 20.25 Шанс-приз. 20.40 Телесериал «Шансы», 7-я серия. 21.30 Студия «БМ»: «Пилигримм». 21.50 Худ. фильм «Из жизни отдыхающих».

Среда, 19 октября

Белорусское телевидение

